**Смолік А.І.**

# ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА І.К. КАНДРАЦЬЕВА ЯК КРЫНІЦА ГІСТАРЫЧНЫХ ВЕДАЎ

Літаратурная творчасць пісьменніка, паэта, драматурга, перакладчыка Івана Кузьміча Кандрацьева (1849–1904) супала з перыядам фарміравання гістарычнай думкі ў Расіі і Беларусі. У XIX ст. многія гісторыкі лічылі сэнсам сваёй дзейнасці ўзвышэнне сваёй нацыі, узвядзенне ўласна славянскай гісторыі да глыбокай старажытнасці. З гэтай мэтай са старажытнасці імі адбіраліся выключна неабходныя, кампліментарныя для нацыянальнай самасвядомасці факты. Гэта былі такія гісторыкі і пісьменнікі як І. Лялявель, І.І. Грыгаровіч, М.І. Балінскі, П.В. Баброўскі, Т.Я. Нарбут, Ю.І. Вянелін, А.Ф. Вельтман, Ю.І. Крашэўскі, Д.І. Ілавайскі, М.В. Доўнар-Запольскі і інш. Прадстаўніком тагачаснай гістарычнай думкі з'яўляўся і І. Кандрацьеў. Сведчаннем таму грунтоўныя аб'емныя працы па гісторыі Маскоўскага Крамля, гісторыі Масквы і яе навакольных населеных пунктах, гістарычныя апісанні Кіева-Пячэрскай лаўры, Валаамскага і Старажоўскага манастыроў, шэраг гістарычных раманаў, авовесцей і паэм.

Наш суайчыннік прыйшоў да высновы аб тым, што лепшай формай, з дапамогай якой магчыма азнаёміць народ з яго гісторыяй, з'яўляецца форма гістарычнага рамана. Гістарызм кандрацьеўскай мастацкай думкі адчуваецца ўжо ў гістарычных драмах «Быль на Волге» і «Пир Стеньки Разина», дзе адлюстраваны падзеі сялянскага паўстання пад кіраўніцтвам С. Разіна. Назіраемая, ахопліваемая розумам рэчаіснасць адкладавалася ў памяці, дзе спела шмат тэм і сюжэтаў, каб праз пэўны час увасобіцца у вобразах не толькі навелістычных, але і раманных аповядаў.

Першы гістарычны раман вялікага памеру «Гуны» І. Кандрацьеў апублікаваў у 1878 г. [1]. У якасці канцэптуальнай асновы аўтар выбраў тэорыю славянства гунаў, якую адстойвалі І.Ю. Вянелін і Д.І. Ілавайскі. Гуны, па іх меркаванню, з'яўляюцца супольнасцю, якая склалася ў II–IV стст. н.э. у Прыўраллі з цюркамоўных хуну і мясцовых уграў і сарматаў. Гуны падначалілі шэраг германскіх і іншых плямён, стварылі магутны саюз плямён, які неаднаразова рабіў спусташальныя паходы ў многія краіны. Найбольшай магутнасці дасягнулі пры Аціле. Пасяля яго смерці ў 453 г. саюз плямён пачаў распадацца. Выбудоўваючы раман «Гуны» як эпічны жанр аб завяваннях готаў і гунаў пісьменнік суадносіць кампазіцыю з іх хронікай.

Важнейшым крытэрыям, накіроўваючым арыенцірам, якіх прытрымліваецца І. Кандрацьеў, на працягу сваіх гістарычных раманаў выступаюць сацыяльныя рэаліі, псіхалагічныя дэталі, побытавыя дробязі ўзнаўляемай эпохі. Дакладнасць іх апісання становіцца нормай аповяду. Сюжэт рамана «Гуны» зададзены гісторыяй і геаграфіяй завяявальніцкіх паходаў готаў, гунаў. Пісьменнік дакладна вызначае межы дзяржавы караля Эрманрыка, якая займала прастору ад берагоў Дона і ўсю Паўночную Еўропу. Венеды (славяне) рассяліліся на Балтыйскім узбярэжжы, па Вісле, Паўночнай Дзвіне, Нёмане [1, с. 7]. І. Кандрацьев імкнецца прытрымлівацца дакладна ўстаноўленых фактаў, дат, падзей, якія зафіксаваны ў пісьмовых крыніцах. З гэтай мэтай у мастацкі тэкст ён уводзіць звесткі вядомых еўрапейскіх і расійскіх гісторыкаў. Для вызначэння гісторыі старажытнага Кіева, які называе сталіцай гунаў, творца прыцягвае працы Саксона Граматыка, Адама Брэменскага, І.Я. Забеліна, П.Й. Шафарыка, Д.І. Іалавайскага і інш. У асобных выпадках празаік абапіраецца на паўночныя сказанні і сагі. Такія крыніцы былі выкарыстаны ім пры вызначэнні тэрыторый, якія заваявалі готы: «По северным сказаниям, или сагам, готы, теснимые из Азии, под владычеством Сиггэ Фридульфзона, т.е. Одена, пришли первоначально в Квенландию, в страну квенов, стало быть, в восточную часть Финнии, жители которой и по настоящее время называются квенами. В то время вся нынешняя Финляндия носила название Квенланд. Оттуда готы начали распространяться до Карпат и Дуная. В придунайских племенах, отстаивавших свои границы от побед Рима, готы нашли и собственную ограду и даже поборников против общего врага – римлян» [1, с. 4]. У рамане створана цэлая галерэя мастацкіх вобразаў, якія рэальна дзейнічалі ў дадзеную гістарычную эпоху: Аціла, Атанарык, Балемір, Будлі, Эрманрык і інш.

Айчынная вайна 1812 г. была самай значнай гістарычнай падзеяй пачатку XIX ст., якая ўзрушыла жыццё не толькі рускага, але і беларускага народаў. 1812 г. знайшоў таксама ўсебаковае адлюстраванне ў рамане «Великий разгром» [2] і аповесці «Божье знамение» [4]. Падзеі Айчыннай вайны 1812 г., якія па-мастацку адлюстроўвае пісьменнік, разгортваюцца на тэрыторыі нашай краіны. Таленавіты творца ў іх разглядае ўсё тагачаснае грамадства зверху данізу, адносіны розных сацыяльных груп да драматычнага эпізода ў айчыннай гісторыі.



Репозиторий ВГУ

Пісьменнік гістарычна праўдзіва ўзнаўляе псіхалагічныя рысы народнага патрыятызму: «Народ чутко отозвался на клич своего государя, и это было не мимолетной вспышкой возбужденного патриотизма, не всеподданнейшим угождением воле и требованиям государя, нет – это было проявление сознательного сочувствия между царем и народом» [4, с. 47]. У рамане і асабліва ў аповесці І. Кандрацьевым створана галерэя вобразаў герояў Айчыннай вайны: М. Кутузава, П. Баграціёна, Барклая де Толі, Ф. Растапчына і інш. Яны выведзены І. Кандрацьевым вельмі станоўча. У апісанні іх учынкаў, думак адчуваецца глыбокая сімпатыя аўтара да гэтых герояў. Імператар Францыі паказаны як нахабны і жорсткі захопнік, дзеянні якога не толькі не апраўданы ні гісторыяй, ні патрэбамі французскага народа, але супярэчаць маральнаму ідэалу чалавецтва: «Человека этого сделала мировым гением грубость, неразборчивость и посредственность, которыми он обладал в более высокой степени, чем грубость, неразборчивость и посредственность» [4, с. 14–15].

Такім чынам, у рамане і аповесці чытачу адкрываюцца старонкі гісторыі Айчыннай вайны 1812 г., тагачаснага побыту. Эпізоды вайннага жыцця вельмі маляўнічыя, захапляючыя, жывымі паўстаюць і сапраўдныя, і літаратурныя героі. І. Кандрацьеву ўдалося ўзнавіць свет вайны, нават больш аб'ёмны, чым сапраўднае жыццё, што дасягаюць далёка не ўсе мастакі слова. Тагачасны расійскі чытач, як паказвае крытыка, сустрэў раман і аповесць станоўча. Так, літаратурны крытык часопіса «Дело» пісаў: «Прошедшее восстает перед нами во всем блеске своего величия. Картины превосходны, а блестящий, образный, энергичный язык автора – верх совершенства и в этом отношении у него только один достойный соперник – Виктор Гюго» [7, с. 252–253].

Наступствы акупацыі французамі Масквы знайшлі адлюстраванне ў гістарычным даведніку «Седая старина Москвы», напісанным І. Кандрацьевым у 1894 г. Пры апісанні помнікаў культуры Крамля, Кітай-горада, Белага і Землянога горада, славутасцей ваколіц Масквы І. Кандрацьеў не праміне сказаць аб стане таго ці іншага артэфакта культуры ў час вайны. З болем распавядае ён аб поўным разрабаванні французамі царквы св. Канстанціна і Алены, пашкоджанні Званіцы Івана Вялікага, знішчэнні Арсенала, Маскоўскага універсітэта з усімі навуковымі скарбамі, з бібліятэкай у 20 тыс. тамоў. Аўтар прыходзіць да высновы, што нашэсце Напалеона было самым страшэнным бедствам, якое выпала на долю масквічоў: «Все тогда гибло в пламени: церкви, дома, великолепные здания, сады, и обгорелые их остатки представляли унылый вид опустошения» [5, с. 31]. Сучасны расійскі гісторык Г. Міронаў так ацэньвае кнігу І. Кондрацьева «Седая старина Москвы»: «Если чадо аристократов и буржуа, обучавшиеся истории отечества в классических гимназиях или дома у гувернеров, читали Кондрацьева для души, наслаждаясь его образной речью, то другие россияне получали из его книг зачастую первую, а то и единственную информацию об истории страны, "достопамятностях" Москвы» [6, с. 5].

Хвалявала І. Кандрацьева праблема марнасці, бездухоўнасці тыраніі, дэспатызму ў феадальным грамадстве. Асабліва грунтоўна дадзеная праблематыка ўвасоблена ў гістарычным рамане «Салтычыха» [3]. Пісьменнікам створаны вобраз вылюдка чалавечага, для якога бязлітаснае мучэнне безабароннай ахвяры з'яўлялася найвышэйшай асалодай. Пісьменнік імкнецца зразумець чаму стала магчымым беспакараннае забойства 75 нявінных ахвяр? Пры гэтым аўтар твора падкрэслівае, што здзекі адбываліся не ў глухім уездзе, Салтычыха пражывала ў Маскве. Самае жудаснае ў гэтай сітуацыі, што на бок вылюдка станавіліся стацкія саветнікі, начальнік паліцмейсцерскай канцылярыі і іншыя чыноўнікі, якія за хабар нават каралі бізуном мужыкоў, што прыходзілі скардзіцца на лютую памешчыцу. З абурэннем піша аўтар: «Из имений Салтыковай тянутся подводы с сеном, мукой и разной живностью – гусями, утками, поросятами – на дворы сговорчивых чиновников» [8, с. 14]. Таму дваццаць адзін раз пачыналася дазнанне аб жудасных справах памешчыцы і кожны раз яна з дапамогай падкупленых чыноўнікаў выходзіла сухой з вады і з яшчэ большай вытанчаннасцю працягвала здзекавацца над сваімі прыгоннымі. І. Кандрацьеў прыходзіць да высновы, што ў існаванні такой атыгуманнай з'явы павінен сацыяльна-эканамічны лад, прыгоннае права.

Гістарычная проза І. Кандрацьева адметна жанравай разнастайнасцю: раманы («Ермак – завоеватель Сибири», «Лютая година», «Казнь Верещагина», «Раскольничьи гнезда»), аповесці, гісторыка-культурныя даведнікі, гістарычныя апісанні манастыроў, тэксты для дзіцяга чытання («Искра Божья»). У іх пісьменнік сабраў і сістэматызаваў велізарнейшы гістарычны матэрыял, які адлюстроўвае важнейшыя старонкі гісторыі Расійскай імперыі, у склад якой уваходзіла і Беларусь. Напісаныя лёгка і займальна, яны з'яўляюцца каштоўнейшай крыніцай гістарычных ведаў.



Репозиторий ВГУ

Шэраг крытыкаў спрабавалі абвінавачваць І. Кандрацьева ў недакладнасці пэўных гістарычных фактаў, якія ўведзены ў тэкст твораў. Не аспрэчваючы гэта, неабходна, тым не менш, заўважыць, што пісьменнік не гісторык, ён не стварае новыя гістарычныя канцэпцыі, а толькі дае белетрыстычную рэканструкцыю падзей далёкага мінулага на падставе высноў, запазычаных з навуковых прац.


1. Кондратьев, И.К. Гунны. Эпоха великого переселения народов: ист. роман из жизни славян IV-го и V-го столетий / И.К. Кондратьев. – Москва : Тип. Э. Лиснер и Ю. Роман, 1878. – 184 с.
2. Кондратьев, И. К. Великий разгром: ист. роман из эпохи кровавых драм и великих смятений / И. К. Кондратьев. – Москва : Издание А. Земского, 1887. – 227 с.
3. Кондратьев, И. К. Салтычиха / И. К. Кондратьев. – М. : И.Я.Поляков, 1895. – 245 с.
4. Кондратьев, И. К. Бич божий. Божье знамение / И. К. Кондратьев ; послесл. К. Новикова. – М. : Панорама, 1994. – 255 с.
5. Кондратьев, И. К. Седая старина Москвы / И. К. Кондратьев. – М. : АСТ, Хранитель, 2008. – 764 с.
6. Миронов, Г. Е. Старая Москва – далекая Москва / Г. Е. Миронов // Кондратьев, И. К. Седая старина Москвы / И. К. Кондратьев. – М. : Воениздат, 1996. – 764 с.
7. Новиков, К. О творчестве Ивана Кондратьева / К. Новиков // Кондратьев, И. К. Бич божий, Божье знамение (часть 2) : повесть / И. К. Кондратьев. – М. : Панорама, 1994. – С. 247–254.
8. Опочинина, Л. Е. Салтычиха «мучительница и душегубица» / Л. Е. Опочинина. – М. : Красная новь, 1923. – 23 с.



**Кручак П.С.**


## М.В. ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ ЯК КРЫНІЦАЗНАЎЦА

Адным з найважнейшых напрамкаў дзейнасці знакамітага беларускага вучонага Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага з'яўлялася крыніцазнаўства. Пачатак крыніцазнаўчай дзейнасці вучонага прыпадае на сярэдзіну 1890-х гг., калі пасля заканчэння гісторыка-філалагічнага факультэта Кіеўскага ўніверсітэта ён быў камандзіраваны ў маскоўскія архівы з мэтай збору матэрыялаў для напісання магістарскай дысертацыі. Тут, працуючы на пасадзе памочніка архіварыюса ў маскоўскім архіве міністэрства юстыцыі, ён разгарнуў актыўную дзейнасць па апрацоўцы і публікацыі гістарычных крыніц, якія адносіліся да гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, і, перш за ўсё, дакументаў Літоўскай Метрыкі.

У 1897 г. выйшаў першы зборнік дакументаў пад рэдакцыяй М. Доўнар-Запольскага – «Дакументы маскоўскага архіва міністэрства юстыцыі». У зборнік былі ўключаныя дакументы па гісторыі служылага землеўладання, гаспадаркі і побыту сялянства, таксама гісторыі сейма ВКЛ. Асаблівае месца ў зборніку займалі матэрыялы рэвізій, якія праводзіліся на дзяржаўных землях ВКЛ у гады праўлення Жыгімонта Аўгуста. М. Доўнар-Запольскі лічыў гэтыя матэрыялы найважнейшай крыніцай па сацыяльна-эканамічнай гісторыі княства ў XVI ст. Вучоны распрацаваў прыблізную схему, па якой павінен праводзіцца аналіз матэрыялаў рэвізій як гістарычных крыніц. Ён вылучыў у гэтай схеме наступныя пункты:

1. Вызначэнне прычын і мэты правядзення рэвізіі;
2. Вызначэнне аб'екта рэвізіі;
3. Вызначэнне парадку яе правядзення;
4. Ацэнка навуковай значнасці крыніцы.

Менавіта такой схемы і прытрымліваўся сам М. Доўнар-Запольскі пры напісанні большасці сваіх работ. У прыватнасці, на прыкладзе рэвізіі Берасцейскага староства ён паказаў навуковую каштоўнасць гэтых матэрыялаў. Вучоны падкрэсліваў, што яны ўтрымліваюць важныя звесткі па тэрыторыі староства, колькасці і шчыльнасці яго насельніцтва, аб'ёме і размеркаванні павіннасцяў і, наогул, дазваляюць характарызаваць сацыяльна-эканамічнае жыццё асобных тэрыторый і княства ў цэлым [3, с. 6].

У 1898 г. М. Доўнар-Запольскі выпусціў другі зборнік дакументаў «Літоўскія упоминки татарскім ордам». У зборнік ўвайшлі дакументы Літоўскай Метрыкі, якія датычацца розных бакоў адносін паміж ВКЛ і татарскімі ордамі. Гэтыя дакументы дазвалялі прасачыць за тым, якое месца займала паўднёвы накірунак у знешняй палітыцы дзяржавы [5].

У 1899 г. М. Доўнар-Запольскі падрыхтаваў да выдання яшчэ адзін зборнік дакументаў «Акты Літоўска-рускай дзяржавы». У зборнік былі ўключаныя дакументы па гісторыі дзяржаўнай гаспадаркі і знешняга гандлю ВКЛ. У прадмове да выдання аўтар ўмоўна падзяліў усе матэрыялы на пяць вялікіх груп:

1. Дакументы па гісторыі мясцовых і карчэмных збораў, якія складалі важную частку дзяржаўных даходаў.

Рэпазіторый ВГУ